*УДК 94(476)«18/19»+323.3:63-051(091)«18/19»*

# СЕЛЬСКОЕ ОБЩЕСТВО В БЕЛАРУСИ ПОСЛЕ ОТМЕНЫ КРЕПОСТНОГО ПРАВА

***А. И. МАСКЕВИЧ***[1)]

[1)]*Белорусский государственный университет, пр. Независимости, 4, 220030, г. Минск, Беларусь*

Рассматриваются вопросы создания и функционирования сельских обществ в Беларуси после отмены крепостного права. Значительное внимание уделяется определению различий между терминами «сельское общество» и «крестьянская община», отмечаются территориальные особенности в деятельности сельских обществ в Беларуси, выделяются их формальная и неформальная структуры. Объект исследования – крестьянство Беларуси во второй половине XIX – начале XX в. Предметом исследования выступают закономерности и особенности создания и существования сельской общины в Беларуси в пореформенный период. Выбор объекта и предмета исследования обусловлен значимостью крестьянства в структуре населения, важной ролью социальной трансформации крестьянства в модернизационных процессах на территории Беларуси в 1860–90-х гг. Цель исследования – определение роли и функций сельского общества в Беларуси после отмены крепостного права через выявление различий между терминами «общество» и «община», изучение его официальной структуры, отражение неформального влияния общества и общественного мнения на крестьянскую жизнь.

***Ключевые слова:*** крестьянство; сельское общество; крестьянская община; сельский сход; сельский староста; общественное мнение.

***Благодарность.*** Автор выражает благодарность доктору исторических наук, профессору декану исторического факультета Белорусского государственного университета Александру Геннадьевичу Кохановскому за помощь в написании статьи.

# СЕЛЬСКАЯ ГРАМАДА Ў БЕЛАРУСІ ПАСЛЯ АДМЕНЫ ПРЫГОННАГА ПРАВА

***Г. І. МАСКЕВІЧ***[1*]

[1*]*Беларускі дзяржаўны ўніверсітэт, пр. Незалежнасці, 4, 220030, г. Мінск, Беларусь*

Разглядаюцца пытанні стварэння і функцыянавання сельскай грамады ў Беларусі пасля адмены прыгоннага права. Значная ўвага надаецца вызначэнню адрозненняў паміж тэрмінамі «сельская грамада» і «сялянская абшчына», адзначаюцца тэрытарыяльныя асаблівасці ў дзейнасці сельскіх грамад у Беларусі, выдзяляюцца іх фармальная і нефармальная структуры. Аб'ект даследавання – сялянства Беларусі ў другой палове XIX – пачатку XX ст. Прадметам даследавання выступаюць заканамернасці і асаблівасці стварэння і існавання сельскай грамады ў Беларусі ў парэформенны перыяд. Выбар аб'екта і прадмета даследавання абумоўлены значнасцю сялянства ў структуры насельніцтва, важнай роллю сацыяльнай трансфармацыі сялянства ў мадэрнізацыйных працэсах на тэрыторыі Беларусі ў 1860–90-я гг. Мэта даследавання – вызначэнне ролі і функцый сельскай грамады ў Беларусі пасля адмены прыгоннага права праз выяўленне адрозненняў паміж тэрмінамі «грамада» і «абшчына», вывучэнне афіцыйнай структуры сельскай грамады Беларусі, адлюстраванне нефармальнага ўплыву грамады і грамадскай думкі на сялянскае жыццё.

**Образец цитирования:**
Маскевіч ГІ. Сельская грамада ў Беларусі пасля адмены прыгоннага права. *Часопіс Беларускага дзяржаўнага ўніверсітэта. Гісторыя.* 2021;1:15–25.
https://doi.org/10.33581/2520-6338-2021-1-15-25

**For citation:**
Maskevich AI. The rural community in Belarus after the abolition of serfdom. *Journal of the Belarusian State University. History.* 2021;1:15–25. Belarusian.
https://doi.org/10.33581/2520-6338-2021-1-15-25

**Автор:**
***Анна Ивановна Маскевич*** – кандидат исторических наук, доцент; доцент кафедры истории Беларуси нового и новейшего времени исторического факультета.

**Author:**
***Anna I. Maskevich***, PhD (history), docent; associate professor at the department of modern and contemporary history of Belarus, faculty of history.
*annamaskevich@gmail.com*

CC BY NC

***Ключавыя словы:*** сялянства; сельская грамада; сялянская абшчына; сельскі сход; сельскі стараста; грамадская думка.

***Падзяка.*** Аўтар выказвае падзяку доктару гістарычных навук, прафесару дэкану гістарычнага факультэта Беларускага дзяржаўнага ўніверсітэта Аляксандру Генадзьевічу Каханоўскаму за дапамогу пры напісанні артыкула.

## THE RURAL COMMUNITY IN BELARUS AFTER THE ABOLITION OF SERFDOM

***A. I. MASKEVICH***[a]

[a]*Belarusian State University, 4 Niezaliežnasci Avenue, Minsk 220030, Belarus*

The article explores the creation and the functioning of rural societies in Belarus after the abolition of serfdom. Considerable focus is given to the definition of differences between the terms «rural society» and «peasant community». Territorial differences in the activities of rural societies in Belarus are noted and their formal and informal structure is highlighted. The object of the study is the peasantry of Belarus in the second half of the 19$^{th}$ – early 20$^{th}$ century. The subject of the study is the regularities and features of creation and existence of rural communities in Belarus in the post-reform period. The choice of the object and subject of the study is determined by the importance of peasantry in the population structure and the principal role of peasantry in the processes of social transformation and modernisation in Belarus in the 1860–90s. The goals of the study are to determine the roles and functions of rural society in Belarus after the abolition of serfdom by identifying the differences between the terms «society» and «community»; to investigate the official structure of rural society in Belarus; and to depict the informal influence of society and public opinion on peasant life.

***Keywords:*** peasantry; rural society; peasant community; rural assembly; village headman; public opinion.

***Acknowledgements.*** The author expresses gratitude to the doctor of science (history), professor dean of the faculty of history of the Belarusian State University Aliaksandr G. Kakhanouski for help during the writing of the article.

### Уводзіны

Адмена прыгоннага права стала моцным штуршком для развіцця мадэрнізацыйных працэсаў як на тэрыторыі Беларусі, так і ва ўсёй Расійскай імперыі. Жыццё асноўнай часткі насельніцтва – сялянства – пачало актыўна і дынамічна змяняцца. У перыяд станаўлення капіталістычных адносін і развіцця нацыятворчых працэсаў у Беларусі ў другой палове XIX – пачатку XX ст. менавіта сялянства стала асновай, з якой фарміраваўся новы сацыяльны пласт насельніцтва – пралетарыят, і сялянства стала той сацыяльнай групай, на падмурку якой фарміравалася беларуская нацыя. Вывучэнне тых працэсаў, што адбываліся ў сялянскім асяроддзі ў парэформенны перыяд (сярод іх – развіццё такога інстытута, як сельская грамада), прадстаўляецца надзвычай важным і актуальным. Айчынная гістарыяграфія накапіла немалы досвед вывучэння сялянства, у тым ліку дзейнасці органаў сялянскага самакіравання. Узгаданая тэма разглядаецца ў працах А. Г. Каханоўскага, В. П. Панюціча, У. А. Сосны, С. А. Талмачовай, С. М. Токця [1–6] і інш. Сельскую абшчыну ў больш ранні час (XVI–XVIII стст.) грунтоўна даследаваў В. Ф. Голубеў [7]. Важны аспект, які да сённяшняга часу застаецца практычна па-за ўвагай даследчыкаў гісторыі Беларусі XIX ст., – вызначэнне адрозненняў паміж тэрмінамі «сельская грамада» і «сялянская абшчына», адлюстраванне фармальнай ролі і нефармальных функцый сельскай грамады ў сялянскім асяроддзі.

Мэта даследавання – вызначэнне ролі і функцый сельскай грамады ў Беларусі пасля адмены прыгоннага права праз выяўленне адрозненняў паміж тэрмінамі «грамада» і «абшчына», вывучэнне афіцыйнай структуры сельскай грамады Беларусі, адлюстраванне нефармальнага ўплыву грамады і грамадскай думкі на сялянскае жыццё.

### Метадалогія даследавання

Базавымі прынцыпамі даследавання з'яўляюцца аб'ектыўнасць, гістарызм, сістэмны аналіз і каштоўнасны падыход. У аснову даследавання былі пакладзены такія агульнанавуковыя метады, як абагульненне, класіфікацыя, дэдукцыя і індукцыя, сінтэз і аналіз, параўнальны аналіз. Пры напісанні артыкула выкарыстоўваліся спецыяльна-гістарычныя метады, а таксама метады іншых навук. Так, з дапамогай гістарычна-сістэмнага метаду была вылучана афіцыйная структура сельскай грамады Беларусі ў парэформенны перыяд. Параўнальна-гістарычны метад дазволіў ахарактарызаваць рэгіянальныя

асаблівасці функцыянавання ніжэйшага звяна сялянскага самакіравання на тэрыторыі Беларусі. Гістарычна-генетычны метад даў магчымасць прасачыць змены ў становішчы і ролі сельскай грамады ў сялянскім грамадстве на працягу 1860–90-х гг. З дапамогай гістарычна-тыпалагічнага метаду стала магчымым знайсці агульныя рысы фарміравання іерархічнай структуры сельскай грамады, упарадкаваць прынцыпы і асновы вылучэння афіцыйных і нефармальных грамадскіх статусаў у сялянскім асяроддзі. Рэтраспектыўны погляд на сацыяльную структуру грамады дазволіў выявіць характэрныя менавіта для парэформеннага перыяду рысы яе існавання. Пры дапамозе метаду герменеўтыкі стала магчымым больш дэтальна і якасна выкарыстаць даныя этнаграфічных крыніц, правесці аналіз тэкстаў. Метады сацыялагічнага аналізу далі магчымасць зразумець і ахарактарызаваць сацыяльная ролі і статус розных іерархічных катэгорый сельскай грамады Беларусі ў парэформенны перыяд.

Крыніцазнаўчую базу даследавання склалі заканадаўчыя акты Расійскай імперыі, дакументы сялянскіх устаноў з фондаў Нацыянальнага гістарычнага архіва Беларусі і Нацыянальнага гістарычнага архіва Беларусі ў г. Гродне, статыстычныя і этнаграфічныя матэрыялы.

## Вынікі і абмеркаванне

Пасля правядзення рэформы 1861 г. шэраг працэсаў, звязаных з усталяваннем новага пасляпрыгоннага ладу, для сялян Беларусі праходзілі аналагічна зменам у іншых рэгіёнах Расійскай імперыі. Асобныя трансфармацыі былі выключнай і адметнай характарыстыкай менавіта беларускага сялянства. Трэба адзначыць, што ў 1861 г. рэформа праводзілася для сялян, якія належалі памешчыкам, і дваровых людзей. На іншыя катэгорыі сялянства правілы выкупу зямельных надзелаў першапачаткова не распаўсюджваліся. Змены, прапісаныя ў асноўным і мясцовых палажэннях 1861 г., упершыню ўводзіліся для прыватнаўласніцкіх сялян, але не ўсе яны былі наватарскімі для астатніх жыхароў вёскі. Пэўныя асобныя палажэнні, якія ўводзіліся ў жыццё прыватнаўласніцкіх сялян, яшчэ ў першай палове XIX ст. былі вядомыя некаторым іншым катэгорыям згаданага слоя насельніцтва. Гэта тычыцца такога важнага элемента сялянскага жыцця, як органы кіравання і самакіравання. Асаблівай увагі заслугоўваюць пытанні стварэння, функцыянавання, развіцця сельскай грамады ў Беларусі і яе ролі ў парэформенным сялянскім жыцці.

Перш за ўсё неабходна разабрацца з тэрміналогіяй і зразумець адрозненні паміж тэрмінамі «сельская грамада» і «сялянская абшчына», блытаніна з якімі часам мела месца ў гістарыяграфіі. Адна з прычын такой сітуацыі – характэрнае для савецкай навукі імкненне да ўніфікацыі адлюстравання сацыяльнай і эканамічнай гісторыі розных рэгіёнаў Расійскай імперыі. Сялянская абшчына, як традыцыйная форма існавання сялянства, існавала ў многіх унутраных губернях, але ў рэчаіснасці была не настолькі арганічнай для сялянства Беларусі. Пасля падзелаў Рэчы Паспалітай тут пачала ўводзіцца такая форма сялянскага землекарыстання, як абшчына. Абшчыннае землекарыстанне было пашырана пераважна ва ўсходніх беларускіх губернях – Віцебскай і Магілёўскай. Сялянства Гродзенскай, Віленскай і Мінскай губерняў не ведала абшчыннай формы карыстання зямлёй. Тут яна была падворнай, што абумовіла значны індывідуалізм саміх гаспадароў, большую асабовую адказнасць у гэтых мясцовасцях.

Важныя сацыяльныя, ідэалагічныя, выхаваўчыя, грамадскія функцыі, якімі звычайна надзяляюць абшчыну, у Беларусі больш карэктна будзе вызначыць для грамадскай думкі і яе важнасці ў сялянскім асяроддзі. Традыцыйнасць і пэўны кансерватызм беларускай вёскі, значная роля думкі і меркавання аднавяскоўцаў з’яўляліся неад’емным элементам сялянскага жыцця, уплывалі на многія рашэнні і ўчынкі, падштурхоўвалі да развіцця або стрымлівалі памкненні. Такая сітуацыя была тыповай для ўсяго беларускага сялянства як на захадзе, так і на ўсходзе. Гэта не залежала ад таго, былі аб’яднаны жыхары пэўнай мясцовасці ў сялянскую абшчыну ці не.

Незалежна ад таго, існавала абшчына як форма землекарыстання ці абшчыннага землекарыстання ў сялян не было (а значыць, і абшчыны як формы землекарыстання), грамадская думка адыгрывала выключна важную ролю ў жыцці селяніна. У такім выпадку можна выкарыстоўваць тэрмін «абшчына», ці, яшчэ больш дакладна, «сялянская абшчына», для абазначэння пэўнай нефармальнай ці надфармальнай катэгорыі, якая мела вялікі ўплыў на сялянскае жыццё. Менавіта ў такім выглядзе абшчына стала інстытутам, які існаваў са старадаўніх часоў і садзейнічаў «захаванню гаспадарчых, юрыдычных, бытавых і культурных традыцый, фарміраванню этнічнай агульнасці насельніцтва» [7, с. 5].

Магчымасць узвесці меркаванні грамадскай думкі да ўзроўню афіцыйных пастаноў, дазволаў ці абмежаванняў была ў большасці сялян пасля рэформы 1861 г. з увядзеннем такой адзінкі сялянскага самакіравання, як сельская грамада. Сельскія грамады ствараліся паўсюдна на тэрыторыі Беларусі незалежна ад форм землекарыстання сялян. Сельская грамада не з’яўлялася абсалютна новым досведам у сялянскім жыцці. Яшчэ ў ходзе рэформы П. Дз. Кісялёва (1840) яна была ўведзена для дзяржаўных сялян. Праўда, такія сяляне на той момант складалі каля 20 % вясковых жыхароў усіх

беларускіх губерняў. У прыватнаўласніцкіх сялян афіцыйныя органы самакіравання з'явіліся толькі ў другой палове XIX ст.

З часоў рэформы П. Дз. Кісялёва дзяржаўных сялян афіцыйна называлі свабоднымі сельскімі абывацелямі. У Агульным палажэнні аб сялянах, што выйшлі з-пад прыгоннай залежнасці, ад 19 лютага 1861 г. (далей – Агульнае палажэнне) абвяшчалася, што памешчыцкім сялянам надаюцца «правы свабодных сельскіх абывацеляў»[1], гэта значыць іх асабістыя правы павінны былі наблізіцца да тых, што мелі дзяржаўныя сяляне. Менавіта ў Агульным палажэнні былі прапісаны асноўныя правілы стварэння і функцыянавання сельскай грамады як ніжэйшай адзінкі сялянскай адміністрацыі. Акрамя гэтага дакумента, адмена прыгоннага права на тэрыторыі Беларусі рэгламентавалася яшчэ двума мясцовымі палажэннямі: для губерняў Віленскай, Гродзенскай, Мінскай і часткі Віцебскай і для губерняў беларускіх[2] (да іх адносіліся Магілёўская і частка Віцебскай (Веліжскі, Віцебскі, Гарадзецкі, Лепельскі, Невельскі, Полацкі, Себежскі і Суражскі паветы, гэта значыць якраз беларуская частка Віцебскай губерні)). Неабходнасць выдання асобных мясцовых палажэнняў была выклікана рознымі тыпамі сялянскага землекарыстання ў названых рэгіёнах, што патрабавала розных правіл надзялення сялян зямлёй і адпаведнага ўладкавання пазямельных адносін з памешчыкамі. У мясцовых палажэннях прапісваліся выключна пытанні зямельнага размеркавання і вызначаліся павіннасці на карысць памешчыка. Пытанні правоў сялян, арганізацыі самакіравання, размеркавання дзяржаўных, земскіх і мірскіх павіннасцей вырашаліся аднолькава для ўсіх рэгіёнаў Расійскай імперыі, у тым ліку і для беларускіх губерняў, і рэгламентаваліся артыкуламі Агульнага палажэння. Сельская грамада стваралася як адзінка сялянскага самакіравання, на яе ўскладаўся шэраг кантралюючых, фіскальных, паліцэйскіх, сацыяльных, ідэалагічных функцый. Ва ўсходніх губернях Беларусі да агульнараспаўсюджаных функцый дадавалася яшчэ і рэгуляванне пазямельных адносін.

Па ўмовах рэформы 1861 г. сяляне заходніх губерняў Беларусі, дзе было распаўсюджана падворнае землекарыстанне, атрымлівалі свае дарэформенныя надзелы. Адрэзкі і пераразлікі зямлі на карысць памешчыка, безумоўна, былі прадугледжаны, але існавалі і пункты ў падтрымку сялян. Напрыклад, у мясцовых палажэннях прапісваліся рэкамендаваныя памеры паншчыны з дзесяціны зямлі, аднак дазвалялася гэтыя памеры памяншаць у выпадку, калі да 1861 г. у сялян яны былі ніжэйшымі за нававызначаныя[3]. Па-іншаму адбывалася размеркаванне зямель ва ўсходніх губернях Беларусі. Пры наяўнасці абшчыннага землекарыстання было немагчыма вызначыць асабістыя дарэформенныя надзелы, таму ўлады вырашылі, што тут «предоставляется в постоянное пользование каждого *сельского общества*... надлежащее, по местным удобствам, количество земли, за которое крестьяне платят оброк или отбывают работу помещику»[4] (курсіў наш. – *А. М.*). Сельская грамада ў дадзеным выпадку выступала яшчэ і землеўласнікам. Далей правіламі рэгламентаваўся яе склад. Туды павінны былі ўваходзіць усе асобы, што былі запісаны ў вёсцы па дзясятай рэвізіі (падушны перапіс насельніцтва ў Расійскай імперыі, праведзены ў 1857–1859 гг.) за памешчыкам, акрамя тых, хто атрымаў асабістую свабоду раней. Прадугледжваўся і некаторы перагляд складу сельскай грамады: да яе павінны былі прыпісацца сяляне з іншых маёнткаў аднаго памешчыка, калі яны змянілі месца жыхарства (пражывалі не ў той мясцовасці, дзе былі прыпісаны да грамады), а таксама дваровыя сяляне, якія карысталіся зямельнымі надзеламі (такім чынам, дваровыя пераходзілі ў разрад часоваабавязаных сялян або сялян-уласнікаў). Разам з тым сяляне, што раней не карысталіся надзелам і зямлю не апрацоўвалі, пры жаданні ці неабходнасці маглі быць выпісаны з грамады і ў размеркаванні зямлі не ўдзельнічалі.

Адрозненне ў функцыянаванні сельскай грамады на захадзе і ўсходзе Беларусі заключалася пераважна ў тым, што ў губернях з абшчынным землекарыстаннем вырашэнне зямельных пытанняў выносілася на агульны сельскі сход, а для губерняў з падворным землекарыстаннем уплыў сельскай грамады на вырашэнне пазямельных пытанняў (звязаных з падворным землекарыстаннем) быў абмежаваны. Некаторыя даследчыкі гісторыі XIX ст. адзначалі, што і на ўсходзе абшчына існавала толькі на паперы, падпарадкоўваючыся законам падворнага землеўладання.

---

[1]Высочайше утвержденное Общее положение о крестьянах, вышедших из крепостной зависимости, от 19 февраля 1861 г. № 36657 // Полн. собр. законов Рос. империи. Собр. 2 : в 55 т. Т. 36. 1861. Отд-ние 1. СПб., 1863. С. 141.

[2]Высочайшее утвержденное Местное положение о поземельном устройстве крестьян, водворенных на помещичьих землях в губерниях: Великороссийских, Новороссийских и Белорусских, от 19 февраля 1861 г. № 36662 // Полн. собр. законов Рос. империи. Собр. 2 : в 55 т. Т. 36. 1861. Отд-ние 1. СПб., 1863. С. 232.

[3]Высочайше утвержденное Местное положение о поземельном устройстве крестьян, водворенных на помещичьих землях в губерниях: Виленской, Гродненской, Ковенской, Минской и части Витебской, от 19 февраля 1861 г. № 36665 // Полн. собр. законов Рос. империи. Собр. 2 : в 55 т. Т. 36. 1861. Отд-ние 1. СПб., 1863. С. 363.

[4]Высочайше утвержденное Местное положение о поземельном устройстве крестьян, водворенных на помещичьих землях в губерниях: Великороссийских, Новороссийских и Белорусских, от 19 февраля 1861 г. № 36662 // Полн. собр. законов Рос. империи. Собр. 2 : в 55 т. Т. 36. 1861. Отд-ние 1. СПб., 1863. С. 232.

Нягледзячы на больш актыўны ўдзел усходніх сельскіх грамад у вырашэнні зямельных пытанняў заходнія грамады таксама не былі цалкам ад іх адхілены. Іх роля ў дадзеным выпадку была кантралюючай. Калі за селянінам назапашваліся нядоімкі або выяўляліся іншыя выпадкі несумленнага адбывання ім павіннасцей, сельская грамада мела права і нават абавязана была ўдзельнічаць у выпраўленні падобных хібаў. Наступная сітуацыя, калі грамада ўдзельнічала ў вырашэнні зямельных пытанняў, узнікала ў выпадку пераразмеркавання спадчыннага ўладання. Перадаць свой спадчынны надзел іншаму гаспадару селянін мог толькі са згоды памешчыка і сельскай грамады. Прычым перадаваць яго можна было выключна сялянам гэтай жа грамады. Сельская грамада павінна была сачыць і за тым, каб у межах адной грамады селянін не ўтрымліваў больш за тры надзелы зямлі. Акрамя таго, існавалі пры падворным землекарыстанні і землі агульныя, якімі распараджалася сельская грамада. У прыватнасці, гэта былі «выпуски и никем не занятые пустопорожние места»[5]. Сельская грамада займалася размеркаваннем такіх земляў паміж сваімі членамі ў выпадку неабходнасці ўладкавання новых двароў ці апрацоўкі дадатковых зямель.

Такім чынам, сельская грамада ў парэформенны перыяд выступала формай грамадскай арганізацыі сялян, з’яўлялася афіцыйнай адзінкай самакіравання ў вёсцы, а сялянская абшчына прадстаўляла сабой форму сялянскага землеўладання, якое існавала ў сельскай грамадзе разам з падворным.

Трэба адзначыць, што пытанне адрознення паміж тэрмінамі «сялянская абшчына» («мір») і «сельская грамада» стала ўздымацца яшчэ ў сярэдзіне XIX ст. пры падрыхтоўцы адмены прыгоннага права. Для распрацоўкі асноўных правіл вызвалення сялян урадам Расійскай імперыі былі створаны спецыяльныя рэдакцыйныя камісіі, якія неаднаразова абмяркоўвалі і пытанне аб размежаванні і значэнні названых тэрмінаў. У выніку рэдакцыйнымі камісіямі было прынята рашэнне аб неабходнасці аб’яднання гэтых двух розных інстытутаў. Прапанавалася замяніць звыклы і больш распаўсюджаны на той момант тэрмін «абшчына» («мір») тэрмінам «сельская грамада». Да сельскай грамады, якая выконвала адміністрацыйныя функцыі, павінны былі перайсці і гаспадарчыя (звязаныя перш за ўсё з вырашэннем зямельных пытанняў) функцыі сялянскай абшчыны [8, с. 62–64]. Такім чынам, кантроль за землекарыстаннем і землеўладаннем сялян ад сялянскай абшчыны пераходзіў да сельскай грамады. У такіх выпадках неабходна было прывесці ў адпаведнасць колькасны склад былой абшчыны і новай сельскай грамады. На практыцы нярэдка здаралася, што некалькі былых абшчын апыналіся ў складзе адной грамады. У такіх выпадках на агульным сельскім сходзе, дзе прысутнічалі ўсе члены грамады, вырашаліся пераважна пытанні агульнаграмадскага значэння. Пры неабходнасці вырашэння пэўных пазямельных праблем скліkaліся сходы, на якія запрашаліся выключна гаспадары-абшчыннікі, што сумесна валодалі зямлёй. Першапачаткова падобная сітуацыя рэгулявалася традыцыйнымі нормамі і толькі ў пачатку XX ст. была замацавана ў афіцыйным заканадаўстве. У 1902 г. выйшла новая рэдакцыя Агульнага палажэння, у якой з’явілася такое паняцце, як «селенныя сходы» [9, с. 635]. Гэтыя ўстановы павінны былі вырашаць зямельныя і звязаныя з імі падатковыя пытанні тых частак сельскіх грамад, што мелі «асобнае валоданне зямлёй» [9, с. 635]. У той жа час сенат актыўна заняўся рэгуляваннем пазямельных пытанняў і зацвердзіў, што ўласнікам зямлі пры абшчынным землекарыстанні выступае сельская грамада [9, с. 513]. Такім чынам, можна сцвярджаць, што сельская грамада з’яўлялася формай грамадскай арганізацыі сялян і ніжэйшай адзінкай сялянскага самакіравання, у той час як сялянская абшчына выступала формай сялянскага землекарыстання і землеўладання і паступова трансліравала свае функцыі сельскай грамадзе, у якой абшчыннае землеўладанне існавала нароўні з падворным.

Пасля адмены прыгоннага права працэс фарміравання сельскай грамады ў асяроддзі памешчыцкіх сялян строга рэгламентаваўся тым жа Агульным палажэннем. У прыватнасці, у адну сельскую грамаду маглі ўваходзіць толькі сяляне, што належалі аднаму памешчыку. Як правіла, гэта былі аднавяскоўцы, але дазваляліся і некаторыя выключэнні. Калі пасяленне з’яўлялася рознапамесным, то тэрыторыя кожнага памешчыка складала асобную сельскую грамаду. Калі пасяленні былі зусім невялікімі (выселкі, хутары, аднаселлі і інш.), то іх можна было аб’ядноўваць у адной грамадзе, але пры абавязковай умове іх блізкага размяшчэння і карыстання агульнымі надзеламі ці наяўнасці «других общих хозяйственных выгод»[6]. Колькасць насельніцтва ў пасяленні, якое магло ўтварыць адну сельскую грамаду, не павінна была складаць менш за 20 рэвізскіх душ мужчынскага полу. У адваротным выпадку такое пасяленне прыпісвалася да іншай грамады або аб’ядноўвалася з такімі ж невялікімі пасяленнямі.

Некаторыя даследчыкі гісторыі канца XIX ст. выказвалі думку, што пасля адмены прыгоннага права ўлада памешчыкаў над сялянамі была заме-

[5]Высочайше утвержденное Местное положение о поземельном устройстве крестьян, водворенных на помещичьих землях в губерниях: Виленской, Гродненской, Ковенской, Минской и части Витебской, от 19 февраля 1861 г. № 36665 // Полн. собр. законов Рос. империи. Собр. 2 : в 55 т. Т. 36. 1861. Отд-ние 1. СПб., 1863. С. 352.

[6]Высочайше утвержденное Общее положение о крестьянах, вышедших из крепостной зависимости, от 19 февраля 1861 г. № 36657 // Полн. собр. законов Рос. империи. Собр. 2 : в 55 т. Т. 36. 1861. Отд-ние 1. СПб., 1863. С. 147.

нена ўладай грамады, а праз яе – фактычна ўладай органаў сялянскага кіравання, якім у адміністрацыйным плане была падпарадкавана сельская грамада як ніжэйшая адміністрацыйная адзінка [10, с. 9]. Раней селянін не мог без згоды памешчыка змяніць месца жыхарства, правесці сямейны раздзел і пад., а зараз ён не мог зрабіць гэтага без згоды грамады, якая з'яўлялася важным кантралюючым органам сялянскага жыцця з той асаблівасцю, што кантроль гэты ажыццяўлялі самі сяляне – члены грамады.

З фарміраваннем і развіццём унутранай структуры сельскай грамады ў асяроддзі беларускага сялянства ўзнікалі новыя, нехарактэрныя раней для сялян, падмуркі сацыяльнага расслаення. Паступова фарміравалася новая ўнутрысаслоўная сацыяльная іерархія сялянства, якая вызначалася не толькі афіцыйным месцам асобы ў грамадзе, але і нефармальнай роляй, ступенню грамадскага ўплыву і значнасці асобы. Афіцыйная структура сельскай грамады дакладна вызначалася ў Агульным палажэнні. Ніжэйшымі і самымі блізкімі да сялян установамі сялянскага самакіравання, якім была падпарадкавана дзейнасць грамады, з'яўляліся сельскія праўленні.

Сельскае праўленне складалася з сельскага старасты і сельскага сходу. Акрамя сельскага старасты, у вёсцы існавалі і іншыя службовыя асобы, якія забяспечвалі дзейнасць сельскага праўлення. Аднак трэба адзначыць сельскіх пісараў, зборшчыкаў падаткаў, дазорцаў хлебных запасных магазінаў, лясных і палявых вартаўнікоў, службы соцкіх і дзясяцкіх. Аднак у Беларусі па прычыне таго, што ў склад сельскіх грамад уваходзіла невялікая колькасць людзей, сельскія пісары ў многіх мясцовасцях замяняліся валаснымі. Тое ж магло быць і з сельскімі старастамі. У выпадку, калі ў воласці была адна грамада, пасада сельскага старасты скасоўвалася і яго абавязкі выконваў валасны старшына. У такіх сітуацыях для дапамогі валаснаму старшыне выбіраўся яшчэ памочнік. Сельская грамада павінна была забяспечыць двух кандыдатаў, якія пры неабходнасці, надзвычайнай сітуацыі маглі хутка замяніць сельскага старасту на яго пасадзе. Пасады кандыдатаў не былі пастаяннымі, а толькі знаходзіліся на ўліку на выпадак хваробы ці адсутнасці афіцыйнага кіраўніка.

Пасада сельскага старасты была найвышэйшай у сельскай грамадзе. Адначасова ў сістэме вясковай адміністрацыі сельскі староста прадстаўляў ніжэйшае звяно кіраўніцтва. Прадстаўніком ніжэйшай адміністрацыі быў і валасны старшына, але сельскі староста падпарадкоўваўся нават яму. Лічылася, што пасада першага мела большую значнасць і аўтарытэт сярод сялян [11, с. 29]. Тым не менш менавіта сельскі староста выконваў непасрэдны нагляд за грамадой і ажыццяўляў кіраванне ёй, сачыў за выкананнем грамадой яе афіцыйных функцый. Валоданне ўладай, безумоўна, надавала селяніну, які займаў пасаду сельскага старасты, больш высокі афіцыйны статус у параўнанні з аднавяскоўцамі, вылучала яго з шэрагу іншых членаў грамады. Разам з тым такі адносна высокі афіцыйны статус старасты не заўсёды адпавядаў яго рэальнаму становішчу, уплыву ў грамадзе і мог быць даволі зменлівым. Нярэдка здаралася так, што на працягу нават аднаго тэрміну службы статус старасты мяняўся, вагаўся ў розныя бакі, яго аўтарытэт то ўзрастаў, то паніжаўся. Тэрмін службы сельскага старасты складаў тры гады, але законам не забараняліся і неаднаразовыя перавыбары адной і той жа асобы на гэту пасаду. Свайго абіралі кіраўніка самі ж члены грамады. Такая сітуацыя давала магчымасць атрымаць кіруючую пасаду ў залежнасці ад грамадскай думкі, павагі і аўтарытэту. У першыя парэформенныя гады сяляне, якія імкнуліся да кіраўніцтва, намагаліся заваяваць тыя самыя аўтарытэт і павагу сярод аднавяскоўцаў, дэманстравалі свае найлепшыя гаспадарчыя і чалавечыя якасці перад грамадой, што забяспечвала ім выбранне на пасаду. Даследчыкі сялянскага побыту часам адзначалі, што распаўсюджанымі заганамі вяскоўцаў былі лянота, непрацавітасць [12, с. 500; 13, s. 38]. У такіх умовах асновай для абрання на пасаду маглі стаць нават звычайныя гаспадарлівасць і дбайнасць. З цягам часу сітуацыя нярэдка мянялася, неабходнасць у тым, каб залагодзіць грамаду, прападала, і вяскоўцы нярэдка пачыналі скардзіцца на сваё кіраўніцтва і выказваць незадаволенасць ім.

Заганы сельскіх стараст, якія выклікалі найбольшую незадаволенасць і абурэнне сялянства, – п'янства, хабарніцтва, злоўжыванне службовымі паўнамоцтвамі – не былі незвычайнымі. Выбіраючы сабе кіраўніка, сяляне разлічвалі, што ён будзе ў першую чаргу адстойваць агульнаграмадскія інтарэсы, працаваць для вяскоўцаў. На справе нярэдка здаралася, што сельскія старасты намагаліся выслужыцца перад вышэйшымі ўладамі і грэбавалі інтарэсамі сялян. Напрыклад, І. Ханевіч – староста вёскі ў Слонімскім павеце – раздаваў дваранам і памешчыкам сялянскі хлеб (збожжа) з запасных сельскіх магазінаў, у падзяку за гэта ён атрымліваў будаўнічыя матэрыялы (лес) для свайго дома[7]. Нярэдкімі былі выпадкі, калі тыя ж сродкі з сельскіх запасных магазінаў ці з мірскіх сум, агульныя грошы на выплаты казённых нядоімак старасты выкарыстоўвалі для задавальнення ўласных патрэб (будаўніцтва жылля, гаспа-

[7]Нац. гіст. арх. Беларусі ў г. Гродне (НГАБ у г. Гродне). Ф. 12. Воп. 3. Спр. 266. Арк. 1, 7.

дарчых пабудоў, «сяброўства» з прадстаўнікамі вышэйшых улад)[8]. Здаралася і такое, што кіраўнікі вёскі ўчынялі пабоі членаў сялянскіх сем'яў, нават жанчын. Былі выпадкі, калі сяляне пасля гэтага заставаліся інвалідамі на ўсё жыццё[9].

Падобныя сітуацыі прыводзілі да таго, что пасада сельскага старасты з цягам часу губляла сваю значнасць і прэстыж. На гэта былі і іншыя прычыны, звязаныя з паступовым знікненнем жадання ў саміх сялян быць выбранымі на гэту пасаду. Справа ў тым, што, акрамя кіруючых паўнамоцтваў і больш шырокіх магчымасцей, староста меў і шэраг даволі адказных і няпростых абавязкаў. Ён нёс адказнасць за дзейнасць усёй грамады, скаардынаваць якую было не заўсёды проста. Выплата мірскіх і казённых падаткаў, выкананне грамадскіх і дзяржаўных абавязкаў, праца сельскага сходу і прыняцце агульных рашэнняў – усё гэта ляжала на плячах сельскага старасты. Ён адказваў за грамаду, і менавіта на яго ўскладалася пакаранне пры наяўнасці недахопаў па службе, нездавальняючых вынікаў працы сельскіх сходаў, нядоімак і г. д., хоць вінаваты ў гэтым быў не асабіста сельскі староста, а ўся грамада ці асобныя неруплівыя гаспадары, часам нават звычайныя прыродныя абставіны (пажары, паводкі і пад.).

Не спрыяла росту сацыяльнага статусу сельскага старасты і тое, што ён з'яўляўся прадстаўніком найніжэйшага звяна вясковай адміністрацыі і шмат у чым залежаў ад валасных, павятовых, губернскіх улад. Зразумела, у такіх умовах самастойнасць і магчымасці сельскага кіраўніцтва былі значна абмежаванымі. Нярэдка служба старасты прадстаўлялася хутчэй цяжарам, чым ганаровым абавязкам, таму паступова складвалася сітуацыя, калі сяляне не імкнуліся заняць гэту пасаду ў грамадзе. Не выпраўлялі сітуацыю нават ільготы і матэрыяльнае забеспячэнне, што належалі старастам. З цягам часу павялічвалася колькасць прашэнняў аб датэрміновым звальненні ад стараст, якія не жадалі працягваць службу, лічылі яе цяжкім абавязкам[10]. Пасада старасты ўжо не разглядалася як прэстыжная і аўтарытэтная, асабліва для прыстойных, сумленных, заможных гаспадароў. Апошнія дзякуючы свайму матэрыяльнаму становішчу і без таго мелі аўтарытэт у грамадзе і маглі ўплываць на працу сельскага сходу і прынятыя ім рашэнні. Такая сітуацыя стала прычынай таго, што выбары сельскага старасты нярэдка пераўтвараліся ў фармальнасць. Здаралася так, што выбранымі аказваліся сяляне, якія самі на сходзе не прысутнічалі, знаходзіліся нават за межамі Беларусі, былі на заробках у іншых губернях Расійскай імперыі [2, с. 62]. Такія асобы павінны былі ў абавязковым парадку падпарадкавацца рашэнню грамады і тэрмінова вярнуцца на месца жыхарства для выканання сваіх абавязкаў. Падставамі для адмовы і змены рашэння грамады магло быць толькі тое, што селянін выбіраўся на пасаду ўжо не першы раз, або выплата ім грашовай кампенсацыі за нежаданне вяртацца і кіраваць грамадой. Як бачна, становішча кіраўніцтва сельскай грамады не было пастаянным і адназначным. Яно вызначалася не толькі афіцыйнымі паўнамоцтвамі і магчымасцямі, але і асабістымі якасцямі, уласнымі паводзінамі селяніна, грамадскай думкай. Высокі афіцыйны статус асобы не абавязкова забяспечваў яе нефармальнае лідарства.

Сельскі сход з'яўляўся афіцыйным кіруючым органам сельскай грамады, у дзейнасці якога былі адлюстраваны асноўныя яе функцыі. На сходзе вырашаліся актуальныя пытанні сялянскага існавання. Разам з тым у дзейнасці сельскага сходу раскрываліся і нефармальны бок сялянскага жыцця, унутрыграмадскія адносіны і асабістыя стасункі. Удзел у сельскім сходзе маглі прымаць усе сяляне грамады, нават беззямельныя гаспадары і жанчыны. Толькі пры вырашэнні зямельных пытанняў да ўдзелу ў сходзе запрашаліся выключна сяляне-гаспадары, якія валодалі зямлёй, або іх прадстаўнікі. Старшынства на сельскім сходзе афіцыйна належала старасце. На справе заможныя і ўплывовыя гаспадары нярэдка схілялі сход да прыняцця больш карысных для іх рашэнняў. Усе пастановы сельскага сходу прымаліся шляхам прамога галасавання праз дасягненне згоды не менш чым 2/3 гаспадароў, прысутных на сходзе. Нярэдка атрымлівалася так, што беззямельныя і бедныя гаспадары не прыходзілі нават на агульныя незямельныя сходы, і справы вырашаліся без уліку іх думкі на карысць больш заможнай часткі вяскоўцаў. Такая сітуацыя не засталася незаўважанай для ўрада, які рабіў пэўныя захады па павелічэнні колькасці сялян-уласнікаў. У парэформенны перыяд на вырашэнне сельскага сходу былі аддадзены пытанні надзялення бабылёў (беззямельных сялян) зямлёй. Паўплывала на перадачу такіх абавязкаў сельскім сходам менавіта важная роля грамады ў сялянскім жыцці, яе функцыя выразніка сялянскіх інтарэсаў і кантролю над мясцовымі парадкамі. На справе аказалася так, што сельскія сходы не спрыялі павелічэнню колькасці сялян-землеўласнікаў, нярэдка прымалі адмоўныя рашэнні па адпаведных пытаннях. Разам з тым справаздачы па іх рашэннях павінны былі змя-

[8]Нац. гіст. арх. Беларусі. Ф. 2642. Воп. 1. Спр. 115. Арк. 63.
[9]Там жа. Арк. 117, 148.
[10]Там жа. Ф. 242. Воп. 1. Спр. 126. Арк. 4–6.

шчаць станоўчыя пастановы, адлюстроўваць вырашэнне праблем беззямельных сялян. Гэта прымушала сельскае кіраўніцтва часам ісці на падман, фальсіфікацыю фактаў, калі наяўнасць беззямельных сялян у грамадзе проста замоўчвалася. Нярэдкімі былі скаргі, падобныя на скаргу сялян в. Карповічы Гродзенскага павета, калі староста не ўключыў іх у спіс беззямельных гаспадароў, нягледзячы на тое, што яны «цярпелі вялікую нястачу»[11]. Адзначым, што гэту скаргу адмовіліся разглядаць нават вышэйшыя ўлады, кіруючыся, мабыць, «карпаратыўнай этыкай». У падобных сітуацыях выяўлялася выключная роля сельскага сходу і грамады ў магчымасцях асобнага селяніна ці сялянскай сям'і змяніць матэрыяльны статус і палепшыць свой дабрабыт. У такіх выпадках сельскі сход выступаў адной з галоўных перашкод сацыяльнай мабільнасці бедных катэгорый сялянства.

Для нежадання сельскай грамады ўключаць у свой склад беззямельных гаспадароў былі прычыны. Справа ў тым, што да адмены прыгоннага права беззямельныя сяляне маглі цалкам вызваляцца ад падаткаў або абкладацца асобнымі адмысловымі падаткамі з улікам іх маёмаснага становішча. Пасля 1861 г. такія сяляне паўсюдна пачалі ўключацца ў склад сельскіх грамад без надзялення зямлёй, але з абкладаннем падаткамі і павіннасцямі, як гэта было з іншымі сялянамі-ўласнікамі – членамі грамады. Такая сітуацыя тлумачылася тым, што ў большасці мясцовасцей Беларусі падушны падатак размяркоўваўся пароўну, без уліку мясцовых умоў і ступені забяспечанасці сялян зямлёй [2, с. 68]. Пры наяўнасці кругавой парукі ў адбыванні пэўных павіннасцей і выплаце падаткаў асноўны цяжар за нядоімкі беззямельных клаўся на плечы больш забяспечаных гаспадароў, што не спрыяла іх добраму стаўленню да беднякоў. Беззямельныя сяляне, хоць і з'яўляліся афіцыйна членамі сельскай грамады, але на практыцы былі амаль выключаны з удзелу ў грамадскім жыцці, іх магчымасці прававой абароны сваіх інтарэсаў былі вельмі абмежаванымі. Часта ўдзел іх у сельскіх сходахператвараўся ў фармальнасць, або яны ўвогуле на сходзе не прысутнічалі. Праўда, існавалі магчымасці змяніць такое становішча беднякоў. Яны былі звязаны з абраннем на пасаду сельскага старасты. Пэўнага маёмаснага цэнзу тут не існавала, таму нярэдка атрымлівалася так, што абіраліся на службовыя пасады менавіта бедныя і малазабяспечаныя гаспадары, паколькі большая частка ўплывовых і заможных гаспадароў ад гэтых абавязкаў адмаўляліся. Такая сітуацыя і абранне на кіруючую пасаду мала ўплывалі на змену рэальнага сацыяльнага статусу старасты: пасада не надавала яму асабістага аўтарытэту і прэстыжу.

У працы сельскіх сходаў былі адлюстраваны і нефармальныя сацыяльныя стасункі ў межах сельскай грамады. Шматлікія дакументы аб дзейнасці сельскіх сходаў, іх пастановы і рашэнні сведчаць, што ў большасці выпадкаў на іх прыняцце ўплывалі не столькі прадстаўнікі афіцыйных кіруючых пасад (сельскія старасты), колькі вяскоўцы, якія карысталіся нефармальным уплывам і аўтарытэтам у грамадзе. Найбольшую колькасць сярод іх складалі заможныя гаспадары. Менавіта яны імкнуліся падпарадкаваць дзейнасць сельскага сходу і жыццё грамады сваім уласным інтарэсам. Адмоўныя паводзіны сельскіх стараст (п'янства, хабарніцтва і г. д.) таксама не спрыялі росту іх аўтарытэту. А гаспадарлівасць, дбайнасць, працавітасць, якімі звычайна вызначаліся ўласнікі паспяховых гаспадарак, вельмі цаніліся сярод сялянства і выклікалі павагу. Таму менавіта такія гаспадары нярэдка выступалі нефармальнымі лідарамі на сельскіх сходах. Зразумела, што гэта ставіла вырашэнне пытанняў заможнай часткі сялянства ў прыярытэт перад праблемамі беднаты. Часта вырашэнне галоўных пытанняў адбывалася не справядлівым галасаваннем, а пад уплывам «важакоў грамадскіх спраў», крыкуноў, людзей «бойкіх і плутаватых», нярэдка заможных, за пачастунак ці грашовую ўзнагароду[12].

Не толькі заможнае сялянства аказвала ўплыў на дзейнасць грамады. Валаснoе кіраўніцтва таксама імкнулася паказаць сваю важнасць і значнасць у вырашэнні пытанняў. Найбольшай самастойнасцю грамада карысталася ў вырашэнні гаспадарчых спраў і спрэчак паміж сялянамі, у астатнім – лёгка паддавалася ўплыву валасных старшын і пісараў[13]. Такая сітуацыя прыводзіла да таго, што многія сяляне разумелі фармальны характар сходаў і самі не імкнуліся да ўдзелу ў іх. Часам па сваёй волі яны не з'яўляліся на сход або пасылалі замест сябе жанчын, дзяцей, батракоў, разглядаючы ўдзел у сходзе хутчэй як цяжкую і некарысную справу, чым як ганаровы абавязак і магчымасць быць пачутым. Службовыя асобы і самі не заўсёды імкнуліся запрасіць усіх гаспадароў на сход. Ім дастаткова было толькі прысутнасці 2/3 насельніцтва, неабходныя для

[11]НГАБ у г. Гродне. Ф. 10. Воп. 5. Спр. 564. Арк. 1.

[12]Материалы для изучения современного положения землевладения и сельскохозяйственной промышленности в России. СПб. : Тип. Тренке и Фюсно, 1880. С. 38 ; Свод заключений губернских совещаний по вопросам, относящимся к пересмотру законодательства о крестьянах. Т. 1. Сельское и волостное управление (вопросы 1–25). СПб. : Тип. М-ва внутр. дел, 1897. С. 182.

[13]Материалы для изучения современного положения землевладения и сельскохозяйственной промышленности в России. СПб. : Тип. Тренке и Фюсно, 1880. С. 38.

прыняцця рашэння. Безумоўна, такія абставіны не спрыялі росту значнасці сельскага сходу як органа сялянскага кіравання.

З цягам часу расла колькасць скаргаў членаў сельскай грамады на пастановы сходаў, што таксама з'яўлялася сведчаннем паніжэння іх аўтарытэтнасці сярод сялянства і ўсё больш узрастаючай суб'ектыўнасці ў прыняцці рашэнняў. Лідарамі сярод сялянскіх скаргаў на рашэнні сельскіх сходаў былі незадаволенасць вырашэннем зямельных пытанняў і паводзінамі службовых асоб сялянскага самакіравання, іх зняважлівымі адносінамі да аднавяскоўцаў і членаў іх сем'яў. Найбольш пакорліва прымаліся сялянамі тыя пастановы, якія тычыліся агульных пытанняў дзейнасці грамады[14]. У імкненні павысіць значнасць сельскіх сходаў і прыцягнуць як мага большую колькасць сялян да ўдзелу ў іх губернскія ўлады нават спрабавалі ўвесці меры пакарання за адсутнасць на сходзе, але моцнага ўздзеяння на сялян яны не аказалі. Урадам былі створаны і спецыяльныя камісіі, якія павінны былі займацца вывучэннем і ўдасканаленнем сялянскага жыцця. Гэтыя камісіі прыйшлі да высновы, што ў пачатку 1860-х гг. сельская грамада мела значны ўплыў у сялянскім асяроддзі, але паступова афіцыйная роля яе паніжалася. Не спрыяла станоўчай працы сельскага сходу і некаторая блытаніна, якая існавала ў вызначэнні гаспадароў, што мелі права голасу. На працягу парэформеннага перыяду ў вёсцы натуральным чынам праходзілі сямейныя раздзелы, пры якіх зямля бацькі дзялілася паміж дарослымі сынамі і іх сем'ямі. У такіх выпадках не заўсёды было зразумела, ці можна лічыць новаўтвораныя сем'і самастойнымі гаспадаркамі або ці можа прадстаўляць іх на сходзе толькі ўладальнік першапачатковага надзелу. Існавалі спрэчкі і наконт таго, каго лічыць гаспадаром з правам голасу ў выпадку, калі некалькі сялян валодалі адным участкам.

Распад грамады стрымлівала захаванне на працягу доўгага перыяду кругавой парукі ў выплаце некаторых падаткаў і адбыванні павіннасцей. Толькі ў пачатку 1890-х гг. пачаўся працэс яе ліквідацыі. Першапачаткова ён закрануў тыя сельскія грамады, дзе існавала падворнае землеўладанне. Пры абшчынным землеўладанні кругавая парука захоўвалася і ў пачатку XX ст. Асобныя пастановы, якія афіцыйна паніжалі кантроль грамады над сялянскім жыццём і надзялялі сялян большай асабістай свабодай (адмянялі кругавую паруку, ліквідавалі неабходнасць прыпіскі да грамады, дазвалялі адыход і перасяленні без згоды грамады), былі ўведзены толькі з 1 студзеня 1907 г.

## Заключэнне

Адмена прыгоннага права паклала пачатак фарміраванню сістэмы самакіравання ў сялян, што выйшлі з-пад прыгоннай залежнасці. Агульнымі палажэннямі рэгуляваліся правілы, па якіх павінны былі функцыянаваць органы сялянскага самакіравання, ніжэйшае іх звяно было прадстаўлена сельскімі праўленнямі. Апошнія з'яўляліся прадстаўнічым і кіруючым органам такой асаблівай вясковай структуры, як сельская грамада. Менавіта яна стала важным, а часам і вызначальным фактарам сялянскага жыцця пасля 1861 г. Сельская грамада ў Беларусі існавала паўсюдна і не была тоеснай сялянскай абшчыне. Апошняя выступала пераважна адзінкай землекарыстання, а пазней – і землеўладання сялян. Сельская грамада мела афіцыйна вызначаную структуру і функцыі, разам з тымназіраўся і значны нефармальны яе ўплыў на штодзённае вясковае жыццё. Асновай афіцыйнай сацыяльнай іерархіі беларускага сялянства з'яўляліся ўсталяваныя, замацаваныя законам статусы і стасункі. Афіцыйна дзейнасць сельскай грамады падпарадкоўвалася сельскім праўленням, якія складаліся са сходу і старасты – непасрэднага кіраўніка грамады. Акрамя яго, існавалі іншыя службовыя асобы сялянскай адміністрацыі. У парэформенны перыяд да іх адносіліся сельскія (часам валасныя) пісары, зборшчыкі падаткаў, дазорцы хлебных запасных магазінаў, соцкія і дзясяцкія, лясныя і палявыя вартаўнікі, а таксама кандыдаты на пасаду сельскага старасты. Менавіта так выглядала фармальная структура сельскай грамады ў Беларусі ў 1860–90-я гг. Аднак высокі афіцыйны статус у грамадзе не заўсёды адпавядаў такому ж нефармальнаму стану. Пасада сельскага старасты паступова губляла свой прэстыж і аўтарытэт, станавілася для сялян хутчэй цяжкім абавязкам, чым ганаровай службай. Сапраўдны ўплыў на дзейнасць грамады часцей аказвалі заможныя гаспадары, дбайныя сяляне. Важнымі фактарамі сялянскага жыцця і фарміравання ўнутрыграмадскіх адносін выступалі грамадская думка, асабісты аўтарытэт, індывідуальныя якасці і нефармальныя стасункі. Немалаважнае месца ў дзейнасці грамады займаў сельскі сход. Менавіта ён павінен быў выступаць выразнікам інтарэсаў сялянства і інструментам рэгулявання адносін у вёсцы. На сельскіх сходах фарміравалася і гучала грамадская думка, у іх дзейнасці праяўляліся як афіцыйныя, так і нефармальныя стасункі паміж сялянамі. Аднак на працягу парэформеннага перыяду дзейнасць сельскіх

[14]Материалы для изучения современного положения землевладения и сельскохозяйственной промышленности в России. СПб. : Тип. Тренке и Фюсно, 1880. С. 38.

сходаў у Беларусі пачынае губляць сваю значнасць. Бліжэй на канца XIX ст. назіраўся паступовы спад уплыву сходаў на жыццё сельскай грамады, усё менш іх рашэнні вызначала афіцыйнае кіраўніцтва, часцей асобныя ўплывовыя гаспадары падпарадкоўвалі гэтыя рашэнні сваім уласным інтарэсам. Разам з тым выключны ўплыў грамадскай думкі на сялянскае жыццё працягваў захоўвацца.

Такім чынам, сельская грамада ў Беларусі пасля адмены прыгоннага права прадстаўляла сабой адзінку сялянскага самакіравання, якая мела не толькі афіцыйныя структуру і функцыі, але і адыгрывала важную ролю ў нефармальных сялянскіх стасунках, адлюстроўвала неафіцыйную сацыяльную іерархію ў вёсцы. У той жа час сялянская абшчына ў Беларусі таксама была, але прадстаўляла сабой пераважна форму сялянскага землекарыстання і землеўладання, якая існавала нароўні з падворнай і была распаўсюджана пераважна ва ўсходніх рэгіёнах краіны.

## Бібліяграфічныя спасылкі

1. Каханоўскі АГ. *Сацыяльная трансфармацыя беларускага грамадства (1861–1914 гг.)*. Мінск: БДУ; 2013. 335 с.
2. Панюціч ВП. Прававое становішча сялянства парэформеннай эпохі. *Весці Нацыянальнай акадэміі навук Беларусі. Серыя гуманітарных навук.* 1998;1:58–65.
3. Грышкевіч ТВ, Дрывень ІІ, Жытко АП, Талмачова СА. Самакіраванне ў беларуска-літоўскіх губернях. У: Каваленя АА, рэдактар. *Гісторыя беларускай дзяржаўнасці ў канцы XVIII – пачатку XXI ст. Кніга 1.* Мінск: Беларуская навука; 2011. с. 62–144.
4. Талмачова СА. Эвалюцыя дзейнасці органаў сялянскага самакіравання (1861–1914 гг.). У: Жытко АП, рэдактар. *Гісторыя Беларусі перыяду капіталізму. Частка 2. Актуальныя праблемы аграрнай гісторыі.* Мінск: БДПУ; 2007. с. 5–109.
5. Токць СМ. *Сацыяльныя і культурныя працэсы ў беларускай вёсцы ў другой палове XIX – пачатку XX ст.* Мінск: ДІКСТ БДУ; 2016. 328 с.
6. Сосна УА. Беларускія сяляне і ліквідацыя Рэчы Паспалітай. В: *Научные труды Республиканского института высшей школы. Исторические и психолого-педагогические науки.* 2009;8(часть 1):172–179.
7. Голубеў ВФ. *Сельская абшчына ў Беларусі XVI–XVIII стст.* Мінск: Беларуская навука; 2008. 407 с.
8. Леонтьев АА. *Волостной суд и юридические обычаи крестьян.* Санкт-Петербург: Типография М. Меркушева; 1895. 147 с.
9. Сямейных ЗМ. Міграцыя беларускага сялянства ў гады Сталыпінскай аграрнай рэформы (1906–1914 гг.). *Весці АН БССР. Серыя грамадскіх навук.* 1982;4:53–59.
10. Леонтьев АА. *Крестьянское право. Систематическое изложение особенностей законодательства о крестьянах.* Санкт-Петербург: Юридический книжный магазин И. И. Зубкова под фирмою «Законоведение»; 1914. 372 с.
11. Янчук НА. *По Минской губернии: заметки из поездки в 1886 г.* Москва: Типография А. Левенсон; 1889. 130 с.
12. Дембовецкий АС. *Опыт описания Могилёвской губернии в историческом, физико-географическом, этнографическом, промышленном, сельскохозяйственном, лесном, учебном, медицинском и статистическом отношениях. Книга 3.* Могилёв: Типография губернского правления; 1884. 382 с.
13. Kolberg O. *Dzieła wszystkie. Tom 52: Białoruś – Polesie.* Warszawa: Ludowa Spółdzielnia wydawnictwo; 1968. 571 s.

## References

1. Kakhanouski AG. *Sacyjal'naja transfarmacyja belaruskaga gramadstva (1861–1914 gg.)* [Social transformation of the Belarusian society (1861–1914)]. Minsk: Belarusian State University; 2013. Belarusian.
2. Panyutich VP. [The legal status of the peasantry of the post-reform era]. *Vesci Nacyjanal'naj akadjemii navuk Belarusi. Seryja gumanitarnyh navuk.* 1998;1:58–65. Belarusian.
3. Gryshkevich TV, Dryven' II, Zhytko AP, Talmachova SA. [Self-government in the Belarusian-Lithuanian provinces]. In: Kavaljenja AA, editor. *Gistoryja belaruskaj dzjarzhawnasci w kancy XVIII – pachatku XXI st. Kniga 1.* Minsk: Belaruskaja navuka; 2011. p. 62–144. Belarusian.
4. Talmachova SA. [Evolution of the activity of the bodies of peasant self-government (1861–1914)]. In: Zhytko AP, editor. *Gistoryja Belarusi peryjadu kapitalizmu. Chastka 2. Aktual'nyja prablemy agrarnaj gistoryi.* Minsk: Belarusian State Pedagogical University named after Maxim Tank; 2007. p. 5–109. Belarusian.
5. Tokc' SM. *Sacyjal'nyja i kul'turnyja pracjesy w belaruskaj vjoscy w drugoj palove XIX – pachatku XX st.* [Social and cultural processes in the Belarusian village in the second half of the $19^{th}$ – early $20^{th}$ century]. Minsk: State Institute of Management of Social Technologies of the Belarusian State University; 2016. 328 p. Belarusian.
6. Sosna UA. [Belarusian peasants and the liquidation of the Polish-Lithuanian Commonwealth]. *Nauchnye trudy Respublikanskogo instituta vysshei shkoly. Istoricheskie i psihologo-pedagogicheskie nauki.* 2009;8(part 1):172–179. Belarusian.
7. Golubew VF. *Sel'skaja abshchyna w Belarusi XVI–XVIII stst.* [Rural community in Belarus of the $16^{th}$–$18^{th}$ centuries]. Minsk: Belaruskaja navuka; 2008. 407 p. Belarusian.
8. Leont'ev AA. *Volostnoi sud i yuridicheskie obychai krest'yan* [Volost court and legal customs of the peasants]. Saint Petersburg: Tipografiya M. Merkusheva; 1895. 147 p. Russian.
9. Sjamejnyh ZM. [Migration of the Belarusian peasantry in the years of the Stolypin agrarian reform (1906–1914)]. *Vesci AN BSSR. Seryja gramadskih navuk.* 1982;4:53–59. Belarusian.
10. Leont'ev AA. *Krest'yanskoe pravo. Sistematicheskoe izlozhenie osobennostei zakonodatelstva o krestiyanah* [Peasant law. Systematic presentation of the features of the legislation on peasants]. Saint Petersburg: Yuridicheskii knizhnyi magazin I. I. Zubkova pod firmoyu «Zakonovedenie»; 1914. 372 p. Russian.

11. Yanchuk NA. *Po Minskoi gubernii: zametki iz poezdki v 1886 g.* [In the Minsk province: notes of their trip in 1886]. Moscow: Tipografiya A. Levenson; 1889. 130 p. Russian.

12. Dembovetskii AS. *Opyt opisaniya Mogilevskoi gubernii v istoricheskom, fiziko-geograficheskom, etnograficheskom, promyshlennom, sel'skokhozyaistvennom, lesnom, uchebnom, meditsinskom i statisticheskom otnosheniyakh. Kniga 3* [The experience of describing the Mogilev province in historical, physical-geographical, ethnographic, industrial, agricultural, forestry, educational, medical and statistical relations. Book 3]. Mogilev: Tipografiya gubernskogo pravleniya; 1884. 382 p. Russian.

13. Kolberg O. *Dzieła wszystkie. Tom 52: Białoruś – Polesie.* Warszawa: Ludowa Spółdzielnia wydawnictwo; 1968. 571 s.

*Артыкул паступіў у рэдкалегію 30.12.2020.*
*Received by editorial board 30.12.2020.*